

ПРА ШТО РАСКАЖУЦЬ ВОЧЫ 7

У ПРАГРАМЕ ВЕНЕЦЫЯНСКАГА КІНАФЕСТЫВАЛЮ... 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЛІПЕНЯ 2019 г. СУБОТА № 140 (29007)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей АЎРАМЕНКА, міністр транспарту і камунікацый:**

*«Мы цяпер актыўна думаем над поўнай мадэрнізацыяй «алімпійкі». Гэта наш галоўны транспартны калідор, працягласць якога 610 км. Траса будавалася яшчэ да маскоўскай Алімпіяды-80, і сёння бетон у некаторых месцах літаральна ператвараўся ў друз. У 2008 годзе быў зроблены бягучы рамонт дарогі, але з таго часу прайшло ўжо 11 гадоў. Цяпер трэба больш сур'ёзна падысці да гэтага пытання. Гэта, безумоўна, вельмі буйны праект, на рэалізацыю якога спатрэбяцца сур'ёзныя рэсурсы. Трэба думаць на перспектыву. Гэта будзе дарога першай катэгорыі. Як мяркуецца, яе здадуць да 2024 года. Што датычыцца планаў па рэканструкцыі M1/E30, то хацелася б прыбраць усе перасячэнні на адным узроўні (асабліва шмат іх у Брэсцкай вобласці) і зрабіць з гэтай трасы аўтамагістраль».*

# ХУТАРАНСКАЯ НАЕЗНІЦА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Яўгеніі СЕРАФІМОВІЧ дваццаць гадоў, пятнаццаць з іх яна сябруе са Спірэяй — кабылай белай масці, спакойнай, паслухмянай і з добрым характарам. На ёй у свае дзевяць гадоў Жэня вучылася верхавой яздзе, нават гарцаваць па ўзгорках і лясных сцежках. Цяпер дзяўчына і яе белагрывая прыгажуня Спірэя вучаць дзяцей і дарослых упэўнена сядзець у сядле. Сёлета гаспадыня са сваёй падапечнай наладжваюць змястоўны адпачынкі турыстам, якія летам базіруюцца на беразе возера Супонец, што на Глыбоччыне. На гэтым фота Яўгенія са сваёй сяброўкай Спірэяй і яе жарабяткам Суражам.**

СТАР. 5

## КОРАТКА

- **Новы зернесушыльны комплекс «Сураж» урачыста адкрылі ўчора ў Віцебскім раёне.**



- Грашовыя пераводы беларусам з-за мяжы за другі квартал скараціліся на 8,4 % у параўнанні з летам з ташнім перыядам.
- **У Беларусі прапануюць забараніць у крамах бясплатныя поліэтыленавыя пакеты.**
- Інспекцыя Мінтранса ў чэрвені праверыла больш за 800 аўтамабіляў-таксі, выявіла 660 парушэнняў заканадаўства.

ISSN 1990 - 763X

## Прачытаў — перадай другому

*Сумесны праект «Звязды» і Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь*

# НЕ БЕДАВАЦЬ, А БУДАВАЦЬ

**...Канец ліпеня 1944-га. Ужо вызваленыя Мінск і Барысаў, Полацк і Навагрудак, Пінск і Драгічын, Ліда, Баранавічы... 28 ліпеня ў ходзе Люблін-Брэсцкай наступальнай аперацыі сіламі 28-й, 61-й і 70-й армій адрэзаны нямецка-фашысцкім захопнікам адыходы на захад і вызвалены Брэст. Амаль пяцьдзясят воінскіх часцей і злучэнняў, якія вызначыліся ў баях за горад, атрымалі ганаровыя званні «Брэсцкіх», а Беларусь фактычна цалкам вызваленая ад акупантаў. Савецкія войскі рушылі далей, зганяючы ворага з наседжаных месцаў на тэрыторыі Літвы, Латвіі і Польшчы.**

СТАР. 4



Полесская правда

ПРИКАЗ

От Советского Информбюро

## Прыемная навіна

# ДВА БАСЕЙНЫ, ПРАЗРЫСТАЯ ПЕРАГАРОДКА І ХАМАМ

### Што яшчэ плануецца ў фізкультурна-аздараўленчым комплексе?

**Міханавічы з насельніцтвам каля 10 тысяч чалавек называюць пасёлкам газавікоў. Менавіта тут знаходзяцца тры філіялы адкрытага акцыянернага таварыства «Газпрам трансгаз Беларусь». Гэта маладое паселішча — сярэдні ўзрост жыхароў 40—45 гадоў. У аграгарадку налічваецца нямала сем'яў, дзе выхоўваецца непаўналетнія дзеці. І насельнікі Міханавіч з энтузіязмам успрынялі навіну, што тут будзе пабудаваны шматфункцыянальны фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Гэтую інфармацыю абмяркоўваюць і бабулькі, што бавяць час на лаўках каля пад'ездаў, і дарослыя, і дзеці. Сапраўды, гэтаму населенаму пункту можна пазайздросціць: такія комплексы ёсць далёка не ва ўсіх райцэнтрах Беларусі.**

— Нам вельмі пашанцавала з інвестарам, дзякуючы якому ў недалёкай будучыні ў нас з'явіцца аб'ект, значнасць якога для населенага пункта складана пераацаніць. У фізкультурна-аздараўленчым комплексе прадугледжаны два басейны — вялікі для дарослых і малы для дзяцей, а гэта вельмі важна. Не сакрэт, што сучасныя дзеці, падлеткі амаль увесь вольны час прападаюць у інтэрнэце. І самая галоўная праблема для іх — скаліёз. А водныя практыкаванні, працэдуры найлепшым чынам уплываюць на стан здароўя, — кажа **старшыня Міханавіцкага сельвыканкама Святлана ДАВАЛЬЦОВА.** — Важна і тое, што перагародка паміж дзіцячым басейнам і кафэ плануецца празрыстай. Бацькі змогуць пасядзець, папіць чаю і паназіраць за сваімі малымі.

СТАР. 3

# «ПАЛІТЫКА НЕ ПАВІННА ВІСЕЦЬ НАД ЭКАНОМІКАЙ»

## Пра гэта заявіў Прэзідэнт на сустрэчы з міністрам замежных спраў Латвіі

**Аляксандр Лукашэнка і міністр замежных спраў Латвіі Эдгарс Рынкевічс у Палацы Незалежнасці абмеркавалі перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва. Летась двухбаковы тавараабарот нашых краін узрос на 132,9 % ад узроўню 2017 года і склаў 582,7 мільёна долараў. Але, на думку кіраўніка краіны, гэта толькі пачатак.**

«600 мільёнаў тавараабарот — гэта нішто, можна сказаць, маючы на ўвазе нашы магчымасці і магчымасці ў перспектыве. Я эканаміст і не хацеў бы, каб палітыка вісела над эканомікай. І вельмі рады, што ў нас з Латвіяй, вельмі добрай, утульнай краінай, няма асаблівых праблем», — мяркуе Прэзідэнт.

Ён выказаў разуменне цяжкасцяў, з якімі даводзіцца сутыкацца Еўрапейскаму Саюзу. Але балтыйская суседка знаходзіць магчымасць будаваць роўныя і прыстойныя адносіны з Беларуссю, з удзячнасцю адзначыў Аляксандр Лукашэнка. У сваю чаргу, ён заверыў госця, што рэспубліка будзе ўсяляк імкнуцца развіваць сувязі — у першую чаргу гандлёва-эканамічныя. Менавіта іх Прэзідэнт назваў базай, на якой будуецца дом і палітычных, і дыпламатычных стасункаў.

«Мы ўзаемазалежныя: вы ад кагосьці залежыце, мы ад кагосьці залежым, ад нас нехта залежыць... Маленькіх дзяржаў не бывае. Усе народы роўныя» — такі пункт гледжання кіраўніка дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што Беларусь хоча добрых адносін з усімі часткамі свету.

«Але ні ў якім выпадку ніколі не станем ірваць нашы адносіны з братэрскай Расіяй. Ні за якія грошы! Гэта наша Расія, гэта нашы людзі, якія нас вельмі паважаюць. Чаму мы павінны скоса глядзець на гэтую краіну, якая ў цяжкую хвіліну заўсёды падстаўляла нам плячо?» — запытаўся Прэзідэнт.

У той час Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь не будзе паступацца і прынцыповымі інтарэсамі на Захадзе ці Усходзе, напрыклад з Кітайскай Народнай Рэспублікай.

Кіраўнік Беларусі папрасіў Эдгарса Рынкевічса перадаць найлепшыя пажаданні ўраду і народу Латвіі. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што чуў шмат захопленых водгукаў аб прыгажосці Рыгі, але зрабіў выснову, што і мінскія прасторы латвійскаму госцю не ў цяжар.

«У нас захоўваюцца вялікія прасторы. Як чалавек сельскі, прыхільны да гэтага, з хваляваннем сачу за развіццём Мінска, каб людзі тут жылі камфортна. Таму што не ўсе багатыя, не ўсе могуць паехаць кудысьці да мора, хаця б у Прыбалтыку. Таму кожны чалавек павінен мець магчымасць прайсці дзесьці па вадзе — таму мы водную гладзь гэтую захоўваем; адпачыць у парках з унукамі, з дзецьмі», — растлумачыў свой погляд Аляксандр Лукашэнка.

Ён склаў меркаванне, што міністр замежных спраў Латвіі калі і не ўлюбёны ў Беларусь, то прынамсі ставіцца да яе па-добраму, «пажамежна з любоўю».

«І гэта правільна, мы суседзі», — адзначыў Прэзідэнт.

Эдгарс Рынкевічс перадаў беларускаму лідару прывітанне ад прэзідэнта Латвіі Эгілса Левітса, які ўступіў на пасаду 8 ліпеня, і пацвердзіў запрашэнне наведаць Латвію. Міністр чацвёрты раз прыязджае ў Беларусь і прызнаецца: кожныя два гады бачыць, як Мінск развіваецца.

З тым, што магчымасці для павелічэння тавараабароту ў краін ёсць, госць згадзіўся.

«Усё ў нас цудоўна, але мы можам зрабіць больш», — упэўнены кіраўнік латвійскага знешнепалітычнага ведамства.

У размове з журналістамі ён падкрэсліў, што працягваецца работа над пытаннямі супрацоўніцтва Беларусі і Еўрасаюза, каб прасунуць іх на якасна новы ўзровень. Таксама Эдгарс Рынкевічс паведаміў, што з Прэзідэнтам абмяркоўваліся пытанні рэгіянальнай бяспекі, і дадаў, што паміж адпаведнымі міністэрствамі склаліся добрыя адносіны.

«Магчыма, ёсць рознагалоссі па значных геапалітычных пытаннях з вялікімі суседзямі, але разам з тым мы задаволены развіццём адносін з Беларуссю. Не заўсёды мы можам згадзіцца адно з адным у некаторых пытаннях, але тое, як мы абмяркоўваем гэтыя пытанні, — гэта вельмі добра», — падкрэсліў міністр.

Акрамя таго, ён паабяцаў, што работа над спрашчэннем візавага рэжыму працягнецца. У прыватнасці, падчас чэмпіянату свету па хакею, які мае адбыцца ў 2021 годзе на тэрыторыі абедзвюх краін, гледачы змогуць наведаць Латвію без праблем.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ЗА ПЛЁННУЮ ПРАЦУ, УЗОРНАЕ ВЫКАНАННЕ СЛУЖБОВЫХ АБАВЯЗКАЎ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 275 аб прысуджэнні дзяржаўных узнагарод, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Больш як 80 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці ўдастоены ордэнаў і медалёў за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, выключную адвагу і мужнасць, праяўленыя ў барацьбе са злачыннасцю, у час пажараў, пры выратаванні людзей на вадзе і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, значны асабісты ўклад у забеспячэнне канстытуцыйнай законнасці і ўдасканаленне прававой сістэмы, папярэджанне і спыненне эканамічных правапарушэнняў, абарону інтарэсаў дзяржавы на міжнароднай арэне, развіццё хімічнай прамысловасці, заслугі ў галінах будаўніцтва, гандлю, сувязі, навукі, адукацыі, культуры, мастацтва і спорту.

Ордэнам «За службу Радзіме» III ступені ўзнагароджаны начальнік штаба — першы намеснік камандуючага войскамі Заходняга аператыўнага камандавання Руслан Касыгін, камандзір 361-й базы аховы і абслугоўвання (цэнтральных органаў ваеннага кіравання) Андрэй Расюк, начальнік ракетных войскаў і артылерыі — начальнік аддзела ракетных войскаў і артылерыі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Руслан Чэхаў. Заслугі камандзіра вучэбнай мотастралковай роты 307-й гвардзейскай школы падрыхтоўкі спецыялістаў мотастралковых і дэсантных падраздзяленняў 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў Дзмітрыя Філіповіча адзначаны ордэнам «За асабістую мужнасць».

Першы намеснік міністра замежных спраў Андрэй Еўдачэнка і намеснік дырэктара па вытворчасці і кіраванні якасцю рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут «Ваенпраект» Сяргей Паўленка ўзнагароджаны ордэнам Пашани, прафесар кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандр Гугнін — ордэнам Францыска Скарыны.

Медаля «За выратаванне жыццё» ўдастоены вадзіцель пажарнай аварыйна-выратавальнай часці № 1 Талачынскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС Раман Катужанец, камандзір аддзялення забеспячэння 2-га батальёна радыёперашкод 16-га асобнага палка радыёэлектроннай барацьбы Ваенна-паветраных сіл і войскаў процідапаветранай абароны Андрэй Панамарэнка, навучэнец Навагрудскага дзяржаўнага аграрнага каледжа Барыс Півень.

Вялікая група прадстаўнікоў розных сфер адзначана медалём «За працоўныя заслугі». У іх ліку начальнік аддзялення паштовай сувязі Абяроўшчына Камянецкага раённага вузла паштовай сувязі Святлана Алесюк, начальнік галоўнага ўпраўлення Еўропы і Паўночнай Амерыкі Міністэрства замежных спраў Андрэй Бушыла, ткач ААТ «Полацк-Шкловалакно» Алена Корзун, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення пісьмовых і электронных зваротаў галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта Хрысціна Побаль.

Сярод узнагароджаных медалём Францыска Скарыны загадчык кафедры тэатральнай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Расціслаў Бузук, вядучы майстар сцэны Гомельскага абласнога драматычнага тэатра Уладзіслаў Карака, мастак-жывапісец Алег Скавародка.

Указам таксама прысвоены ганаровыя званні. Заслужаным артыстам Беларусі стала артыстка-вакалістка Маладзёжнага тэатра эстрады Вольга Вронская, заслужанымі дзеячамі культуры Беларусі — дырэктар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір Андрыевіч і кіраўнік заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь узорнага харэаграфічнага ансамбля «Зорка» Цэнтра культуры «Віцебск» Наталля Чарнюк.

Ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» прысвоена дэкану біялагічнага факультэта БДУ Уладзіміру Лысаку, «Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь» — дырэктару прадпрыемства «Інстытут «Ваенпраект» Сяргею Карпаву, «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь» — суддзі Канстытуцыйнага суда Вользе Сяргеевай, «Заслужаны спецыяліст Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь» — начальніку Галоўнага штаба — першаму намесніку камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі процідапаветранай абароны Сяргею Трусу.

Заслужанымі майстрамі спорту Беларусі сталі спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды па падводным спорце Дзмітрый Гаўрылаў, спартсмены-інструктары нацыянальнай каманды па радыёспорце Ганна Шавяленка і Сяргей Швядко.

***

**Супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда» шчыра віншуюць з прысваеннем звання Заслужаны дзеяч культуры Беларусі дырэктара выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», былога звяздоўца, Уладзіміра АНДРЫЕВІЧА. Поспехаў вам, шаноўны Уладзімір Уладзіміравіч, і далейшага плёну ў працы.**

Запрашальнік

# Акорд да сімфоніі тысячагоддзя

## У выхадныя Брэст адзначае Дзень горада і 75-ю гадавіну вызвалення

**Асноўныя мерапрыемствы 1000-гадовага юбілею Брэста запланаваныя на першыя выхадныя верасня. Але свята ў традыцыйны Дзень горада абласны цэнтр не пераносіў і не адмяняў. Свята будзе. І пачаткам яго стала ўрачыстае адкрыццё фантана па вуліцы Савецкай. У гэты ж дзень на тэрыторыі дворыка філармоніі прайшоў канцэрт «Любімаму гораду».**

У суботу па традыцыі да Вечнага агню ў крэпасці будуць ускладзены кветкі. Горад у свой дзень нараджэння аддае даніну памяці абаронцам Брэсцкай крэпасці і воінам-вызваліцелям. На вуліцы Гаўрылава мікраараён на Усход запланаваны вялікі суботні фестываль «Экватар». Тут будуць працаваць дзясяткі зон для ўсёй сям'і. Госці свята змогуць паўдзельнічаць у інтэрактыўным квэсце і спартыўных эстафетах. На сцэнах фестывалю абяцаюць толькі жывую музыку. А ўвечары гэтага дня на плошчы Леніна пройдзе гала-канцэрт з удзелам вялікага зводнага сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам Аляксандра Сасноўскага. Канцэрт назвалі «Вячэрняя сімфонія тысячагоддзя».

А ў нядзелю на гэтай жа плошчы пройдзе канцэрт фестывалю «Класіка ля Ратушы з velcom I A1». Праграма прысвечаная «каралю вальса» — знакамітаму аўстрыйскаму кампазітару і дырыжору Іагану Штраусу — і называецца «Viva, Штраус!». Яшчэ брастаўчан і гасцей горада чакаюць фестываль кветак, «Берасцейскі канцэрт-баль» з удзелам Тома Сінатры і шмат іншых мерапрыемстваў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Партыя Зяленскага выступае за рынак зямлі і лібералізацыю сацыяльнай сферы

Кіраўнік прэзідэнцкай партыі «Слуга народа» Дзмітрый Разумкоў заявіў, што «яны выступаюць за рынак зямельнай уласнасці, а таксама ў цэлым за лібералізацыю сацыяльнай сферы».

«Што датычыцца рынку зямлі, у нас склалася парадаксальная сітуацыя, калі на працягу многіх гадоў людзі фактычна не маглі распараджацца сваёй уласнасцю. Зямля — гэта ўласнасць. Калі мы гаворым пра рынак зямлі, то, напэўна, правільна, калі ўласнік можа распараджацца сваёй уласнасцю, — сказаў ён у эфіры тэлеканала «1+1». — Пазіцыя нашай каманды была наступная: рынак зямлі трэба будзе адкрываць, іншае пытанне — гэта не адбудзецца заўтра».

Акрамя таго, кіраўнік «Слугі народа» дадаў, што было б правільна, калі б ва Украіне былі назапашвальная пенсійная сістэма, страхавая медыцына і ствараліся ўмовы для развіцця дзяржаўнай сістэмы адукацыі і прыватных ВНУ. Пры гэтым называць тэрміны такіх рэформаў Разумкоў не стаў.

### ЗША аднаўляюць смяротнае пакаранне на федэральным узроўні

Міністэрства юстыцыі ЗША заявіла аб аднаўленні прымянення смяротнага пакарання на федэральным узроўні пасля 16-гадовага перапынку, паведамляе ВВС.

Генеральны пракурор Уільям Бар заявіў, што ён даручыў Федэральнаму бюро турмаў прызначыць пакаранні пяці зняволеным, якія знаходзяцца ў камеры смяротнікаў у папраўчай установе строгага рэжыму ў Тэры-Хот (Індыяна). Гаворка ідзе пра найбольш жорсткіх злачынцаў: усе яны былі асуджаныя за забойствы, у тым ліку дзяцей. Яны будуць пакараны ў снежні гэтага года і студзені 2020-га. Усе смяротныя прысуды будуць прыведзеныя ў выкананне з дапамогай ін'екцыі пентабарбіталу.

Выканаўчы дырэктар амерыканскага Інфармацыйнага цэнтра па пытаннях смяротнага пакарання Роберт Данхэм адзначыў, што прэзідэнт Дональд Трамп заўсёды быў перакананым прыхільнікам смяротнага пакарання. «Раней ён прапаноўваў некалькі радыкальных варыянтаў яго прызначэння — у тым ліку за злачынствы, звязаныя з продажам наркотыкаў, а таксама за забойства паліцэйскіх», — адзначыў Роберт Данхэм.

Прэзідэнт ЗША неаднаразова выказваў негатыўнае стаўленне да асуджаных злачынцаў, падкрэсліваючы, што да іх ставяцца празмерна мякка і даюць занадта шмат магчымасцяў абскардзіць вынесеныя ім прысуды. У рамках сістэмы правасуддзя ЗША злачынствы могуць разглядацца ў федэральных судах на нацыянальным узроўні ці ў судах штатаў на рэгіянальным узроўні.

### Названа непаражальная для раку група крыві



Шведскія вучоныя высветлілі, як група крыві можа ўплываць на развіццё раку. Даследаванне, якое доўжылася цэлых 35 гадоў, правялі спецыялісты з Каралінскага інстытута. Яго ўдзельнікамі было больш чым 1,1 мільёна чалавек.

Аўтары новай працы ў гэтай галіне пацвердзілі высновы сваіх калег з Англіі, якія раней заявілі, што людзі з другой групай крыві часцей за іншых схільныя да рызыкі захварэць на рак страўніка. На думку шведскіх спецыялістаў, менш за іншых рызыкуюць захварэць на рак людзі з першай групай крыві, аднак яны часта пакутуюць ад гастрыту і язвы.

У людзей з трэцяй і вельмі рэдкай чацвёртай групай крыві часцей за ўсё выяўлялі рак падстраўнікавай залозы, піша RNS.

Раней тэлеканал RT назваў самыя распаўсюджаныя віды раку ў Расіі. Лідарамі антырэйтынгу ў 2018 годзе сталі рак скуры, рак малочнай залозы і рак лёгкіх. У пачатку ліпеня стала вядома пра стварэнне расійскімі спецыялістамі спецыяльнай мазі, якая можа дапамагчы пазбегнуць аперацыі пры меланоме.

На слыху

# НОВЫ ПРЫЗЫЎ:
## рашэнні будуць прымацца індывідуальна

**У сераду Прэзідэнт падпісаў Закон «Аб змяненні законаў па пытаннях функцыянавання ваеннай арганізацыі дзяржавы». Гэты закон закране тысячы хлопцаў, бо ён устанаўлівае даволі жорсткае правіла — адтэрміноўка на атрыманне адукацыі даецца ўсяго адзін раз. А тыя мужчыны, якія не адслужылі да 27 гадоў, не маючы на тое законных падстаў, не здолеюць паступіць на службу ў сілавыя структуры і ў органы дзяржаўнага кіравання.**

Прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі і абароны, а таксама дэпутаты склікалі з гэтай нагоды адмысловую прэс-канферэнцыю, дзе пастараліся адказаць на пытанні, якія цікавяць прызыўнікоў і іх бацькоў.

### Плюс тры тысячы чалавек

Новы закон наўпрост датычыцца магістрантаў, якія паступілі сёлета. Пра гэта паведаміў **кансультант 1-га ўпраўлення галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генштаба Андрэй МУРАШОЎ.**

Ён расказаў, што ў кожным выпадку прызыўная камісія будзе прымаць рашэнне індывідуальна. Восеньскі прызыў, нагадаем, пачнецца 1 жніўня і працягнецца да 30 лістапада. Закон жа набудзе сілу праз дзесяць дзён пасля афіцыйнага апублікавання.

Гэта значыць, што надыдуць змены і для студэнтаў, якія скончылі каледж і паступілі ва ўніверсітэт сёлета. Яны могуць быць прызваны яшчэ да канца першага семестра.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ** запэўніў, што такія прызыўнікі змогуць узяць адпачынак на час праходжання ваеннай службы і потым вярнуцца ва ўніверсітэт, дзе за імі захаваюць месцы. На такі адпачынак могуць разлічваць і першакурснікі, якія не маюць права ўзяць акадэмічны.

Па словах **начальніка галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення — намесніка начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі Аляксандра ШКІРЭНКІ,** увосень плануецца дадаткова прызваць каля 2-3 тысяч чалавек. Увесну гэтая колькасць складзе прыкладна паўтары тысячы чалавек.

Маладым вучоным, якія цяпер працуюць над даследаваннямі, могуць даць адтэрміноўку па ўказе Прэзідэнта. Для гэтага ўніверсітэты будуць прадстаўляць адмысловыя хадайніцтвы ў экспертны савет. У хадайніцтве павінна змяшчацца інфармацыя, дзе будзе тлумачыцца важнасць іх працы і немагчымасць адрыву ад яе.

**Дэпутат Сяргей БОБРЫКАЎ** падзяліўся лічбамі. У магістратуру на бюджэтную форму навучання паступае каля трох тысяч чалавек. Палова з іх — гэта дзяўчаты, а недзе палова хлопцаў адсейваецца па стане здароўя. Такім чынам, застаецца прыкладна 700 чалавек.

Сяргей Каспяровіч адзначыў: калі тым, хто навучаецца ў магістратуры, дадуць магчымасць служыць у рэзерве, то ў іх будзе магчымасць завяршыць навучанне па індывідуальным плане.

— Скажам, такі малады чалавек не ў лютым разам са сваімі калегамі выйдзе працаваць, а, напрыклад, у сакавіку. Проста дзесьці будзе больш шчыльны графік. Увогуле, у магістратуры мы рыхтуем спецыялістаў, якія будуць займацца навуковымі даследаваннямі. Яны потым пойдуць у аспірантуру, будуць займацца інавацыйнай дзейнасцю. Агульная колькасць такіх студэнтаў бюджэтнай формы навучання — сем працэнтаў ад усяго выпуску тых, хто скончыў ВНУ.

Закон захоўвае адтэрміноўкі, якія даваліся раней. Калі юнак паступіў вучыцца пасля каледжа ва ўніверсітэт або ў магістратуру летась — яму дадуць скончыць навучальную ўстанову. А калі возьмем маладога чалавека, які паступіў сёлета, — у прызыўной камісіі ўжо не будзе падставы даць яму адтэрміноўку.

— Пры гэтым абсалютная большасць выпускнікоў школ і гімназій не карысталася адтэрміноўкамі раней. Для іх на гэтым этапе перад паступленнем у навучальную ўстанову нічога не мяняецца. А вось пасля яе заканчэння права на далейшую адтэрміноўку не будзе: да гэтага часу яна ўжо будзе выкарыстана, — патлумачыў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРТЫНАЎ.**

### Пра абмежаванне выезду

Ужо больш за дзесяць гадоў ваенкаматы абмяжоўваюць выезд тым прызыўнікам, якія павестку атрымалі, а на прызыўныя мерапрыемствы не з'явіліся.

— Цяпер жа гэтае кола пашыраецца, — зазначыў Андрэй Мурашоў. — Калі прызыўнік змяніў месца жыхарства, а ў ваенкамат пра гэта не паведаміў, то яго аўтаматычна прыраўнаюць да ўхіліста. Справа ў тым, што ваенкамат у такім разе пазбаўляецца магчымасці ўручыць павестку: невядома, куды адпраўляць дакумент.

Рашэнне аб абмежаванні выезду будзе прымаць ваенны камісар. Яно будзе дзейнічаць да таго часу, пакуль прызыўнік не прыбудзе ў ваенкамат. Рашэнне можна апратэставаць і ў судовым парадку.

### А калі дзіця нарадзілася ў замежжы?

Калі ў малога адзін з бацькоў — грамадзянін Беларусі, то і ён аўтаматычна атрымлівае наша грамадзянства. Таму дзеці, якія нарадзіліся за мяжой або выехалі туды разам з бацькамі, маюць беларускія пашпарты. Ці будзе ў іх абмежаванне па выездзе, калі яны захочуць наведаць Беларусь?

— На сайт Міністэрства абароны ідзе плынь лістоў з далёкага замежжа, — кажа Андрэй Мурашоў. — У нас ёсць звароты з Італіі, Германіі, Нарвегіі. Грамадзяне задаюць пытанне нават пра ненароджаных дзяцей. Яны пытаюцца, як быць, бо хочуць, каб сын меў грамадзянства Беларусі. Мы кажам, што ніякіх перашкод пры выездзе для іх не будзе.

### Сын вучыцца за мяжой? У яго толькі адна адтэрміноўка

Штогод студэнты, якія паехалі па вышэйшую адукацыю ў іншыя краіны, павінны падаваць у ваенкаматы натарыяльна завераную даведку з універсітэта. Там павінна быць указана, якую ступень адукацыі яны атрымліваюць. А далей — усё як і для тых студэнтаў, якія вучацца ў беларускіх ВНУ. Гэта значыць, калі яны знаходзяцца на першай ступені — бакалаўрыяце, — то адтэрміноўка дадзена будзе, а вось пры паступленні ў магістратуру і аспірантуру ўжо не.

Выключэнне будзе зроблена толькі для студэнтаў, якія паехалі вучыцца за мяжу па дзяржзамове.

### На абскарджванне рашэння камісіі — усяго тыдзень

Бывае так, што меркаванні прызыўніка і прызыўной камісіі аб ступені прыдатнасці да вайсковай службы кардынальна разыходзяцца. І ў такім выпадку юнак можа абскарджваць рашэнне прызыўной камісіі ў судзе. Раней на гэта давалася трыццаць дзён. Цяпер — усяго сем. Міністэрства абароны аргументуе істотнае скарачэнне гэтага тэрміну тым, што працэс абскарджвання часам «перакрываў» па часе тэрміны прызыву. Гэта значыць, што судовае рашэнне па іску выносілася пазней, чым заканчвалася адпраўка ў войска.

— Гэтага часу цалкам дастаткова, — адказаў на пытанне «Звязды» Андрэй Мурашоў. — Рашэнне прызыўной камісіі можна атрымаць у той жа дзень, калі адбылося яе пасяджэнне. З гэтага часу і пайшло сем дзён. Усё, што трэба падаць у суд падчас абскарджвання, — гэта заяву і само рашэнне прызыўной камісіі. А дакументы аб стане здароўя, на падставе якіх прызыўная камісія выносіць свой вердыкт, у медыцынскіх установах выдаюцца на рукі.

### Ці будуць «пернікі»?

— Міністэрства адукацыі прапануе даваць тым, хто адслужыў, інтэрнат у ВНУ ў льготным парадку, — зазначыў Сяргей Каспяровіч. — Таксама мы прапануем запусціць механізм ільготнага паступлення на першую ступень вышэйшай адукацыі для былых вайскоўцаў, а на некаторыя спецыяльнасці ўвесці і пазаконкурснае залічэнне. Але абітурыент мусіць пры гэтым мець атэстат аб сярэдняй адукацыі з высокім балам і рэкамендацыю ад кіраўніцтва воінскай часці.

Таксама калі выпускнік універсітэта або каледжа паступіў на службу па кантракце, то яму не давядзецца кампенсаваць дзяржаве грошы, патрачаныя на яго падрыхтоўку.

А пакуль застаецца чакаць афіцыйнага апублікавання дакумента. На момант падрыхтоўкі матэрыяла закон у агульным доступе не з'явіўся.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Спорт-тайм

## ГУЛЬНІ З ГІСТОРЫЯЙ

Зборная Беларусі ўпершыню выйшла ў фінальную частку чэмпіянату свету па пляжным футболе

Падчас другога кваліфікацыйнага турніру ў групе 1 беларусы сенсацыйна абыгралі спачатку чэмпіёнаў свету 2007 года Партугалію — 3:2, а затым і Італію ў серыі пенальці — 4:3 (3:3 у асноўны час). Гэта дазволіла ім разлічваць на высокае месца ў групе і гарантаваць сабе выхад у фінальную частку чэмпіянату свету.



А фінальная частка з удзелам 16 найлепшых камандаў пройдзе з 21 лістапада да 1 снежня ў парагвайскім Асунсьёне. Два гады таму на сусветным форуме ў сталіцы Багамскіх астравоў Насаў чэмпіёнам стала зборная Бразіліі, якая разграміла ў фінале каманду Таіці з лікам 6:0. Уладальнікамі бронзавых медалёў сталі іранцы, якія перамаглі італьянцаў — 5:3. Адзначым, што бразільцы 14 разоў станавіліся найлепшымі ў свеце, па два «залатыя» ў партугальцаў і расіян, адно — у французаў.

Нагадаем, беларуская каманда створана вясной 2008 года. Першы міжнародны матч зборная Беларусі згуляла ў маі 2008 года супраць зборнай Польшчы падчас вучэбна-трэніровачнага збору на польскай зямлі.

## ДОБРЫ ЛІК, АЛЕ СКЛАДАНЫ МАТЧ

Футбалісты салігорскага «Шахцёра» на сваім полі абгулялі дацкі «Эсб'ерг» у першым матчы другога кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы — 2:0

Беларуская каманда дамінавала на працягу ўсёй гульні, і першы гол гаспадары забілі ўжо на пятай хвіліне, вызначыўся Эліс Бакай. Падвоіць перавагу прадстаўнікам беларускага клуба ўдалося ў другім тайме намаганнямі Паўла Рыбака.

*— Добры лік, але складаны матч. Сапернік моцны, кваліфікаваны — гэта адназначна,* — адзначыў пасля гульні **галоўны трэнер «Шахцёра» Сяргей ТАШУЕЎ.** *— Задача была згуляць «на нуль» ззаду, але ў нашых варот былі моманты: у першым тайме нам адзін раз адкрыта даравалі. Хоць і ў нас таксама былі магчымасці, каб развіць перавагу. Таму ўсё наперадзе і ўсё няпроста.*

Нагадаем, у першым раўндзе Лігі Еўропы «Шахцёр» двойчы мінімальна абыграў мальтыйскі «Хібернянс» (1:0, 1:0). Матч у адказ з «Эсб'ергам» «гарнякі» правядуць у Даніі 1 жніўня.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ДВА БАСЕЙНЫ, ПРАЗРЫСТАЯ ПЕРАГАРОДКА І ХАМАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дарэчы, у Мінскім раёне гэта будзе самае значнае па водным аздараўленні збудаванне. З чаго ж пачалася ідэя?

У 2014 годзе зацверджана праграма «Газпрам — дзецям у Беларусі». У яе межах у краіне будуюцца адпаведныя аздараўленчыя аб'екты. Яны ўжо з'явіліся ў Кобрыне, Мазыры, Оршы, Асіповічах. А сёлета прадугледжаны ў Брэсце і Міханавічах.

Што датычыцца ФАКа, то цяпер працягваецца грамадскае абмеркаванне праекта, прайшла яго прэзентацыя. У мерапрыемстве ўдзельнічалі дэпутаты абласнога, раённага Саветаў, пярвічнага ўзроўню, жыхары аграгарадка, моладзь.

На ўсе пытанні прысутных адказалі спецыялісты, архітэктары, праекціроўшчыкі. Заўваг практычна не было. Самая канструктыўная прапанова, якая прагучала, — не хлараваць ваду, каб выключыць алергічную рэакцыю ў дзяцей, выкарыстоўваць больш сучасныя ачышчальныя сродкі. Гэта было падтрымана інвестарам, які лічыць, што кошт комплексу ў гэтай частцы нельга патанняць. Здароўе людзей — перш за ўсё. Прапанова прынятая праектантамі. Перад ФАКам будзе пляцоўка для правядзення масавых мерапрыемстваў, гульнявая пляцоўка з агароджай і лаўкамі, пляцоўка для баскетбола, для заняткаў сілавымі відамі спорту, дзіцячы гарадок, пешаходная алея.



Такім будзе фізкультурна-аздараўленчы комплекс.

— Гэта будзе аднапавярховы будынак з мінімальнай колькасцю адміністрацыйных кабінетаў, — канстатуе Святлана Уладзіміраўна. — Самыя неабходныя — трэнажорная зала і пакой развіцця, дзе можна будзе займацца аэробікай, ладзіць культурныя мерапрыемствы. Мяркую, што цэнтр будзе прыцягваць шмат наведвальнікаў, якім неабходна як аздараўленне, так і змястоўны адпачынак.

Па прапанове інвестара тут будзе лазневы комплекс з хамамам (турэцкай лазняй). Вядома, што лазня — таксама важная частка культуры аздараўлення, яна надае здароўя, загартоўвае волю і дух.

— Добраўпарадкаванне і азеляненне тэрыторыі комплексу з мэтай эканоміі зробім самі. Упэўнена, жыхары Міханавіч адгукнуцца на заклік, — лічыць Святлана Давальцова. — Па праектаванні мы ідзём па графіку. Наперадзе — экспертыза. З боку інвестара пацвярджаецца фінансаванне ў 2019 годзе. Як сведчыць практыка, інвестар не зацягвае тэрміны будаўніцтва, не дапускае даўгабуду. І калі ўсё складзецца як задумана, можам выйсці на пляцоўку ўжо сёлета і налета разгарнуць актыўнае будаўніцтва.

Аздараўленчы комплекс уключаны ў абласную інвестыцыйную праграму. Гэта добры прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства, якое актыўна развіваецца на Міншчыне. У выніку ў вобласці будуюцца сацыяльныя аб'екты, дзіцячыя сады, школы, жыллё.

Грамадскае абмеркаванне праекта працягнецца да 2 жніўня. Неабыякавыя грамадзяне пакідаюць запісы ў спецыяльным журнале. У асноўным гэта падзякі. Ёсць і просьбы — у прыватнасці, уладкаваць скаладром. Усе заўвагі і прапановы будуць разгледжаны архітэктурна-горадабудаўнічым саветам Мінаблвыканкама.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# НЕ БЕДАВАЦЬ, А БУДАВАЦЬ


Партизанская ПРАВДА
Орган Дуниловичского РК КП(б) Белоруссии и партизанской 6 бригады им. РОКОССОВСКОГО
№ 8 ИЮЛЬ 1944 г.

Белоруссия была и будет Советской.
Красная Армия очистила от немецко-фашистских захватчиков столицу Белоруссии г. МИНСК, областные центры г. ВИЛЕЙКУ, г. БАРАНОВИЧИ, столицу Литовской ССР г. ВИЛЬНЮС.

СЛАВА ОСВОБОДИТЕЛЯМ БЕЛОРУССИИ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але гісторыя падпольнага і партызанскага друку Беларусі на гэтым не завяршылася. Многія выданні працягвалі выходзіць у свет, але ўжо не ў цені, а афіцыйна, расказваючы пра вызваленне і аднаўленне родных вёсак і гарадоў, поспехі Чырвонай Арміі на фронце, працу былых партызан. Так, у Слуцку выдавалася газета «За Сацыялістычную Радзіму», у Ваўкавыску — «Заря» (выданне існуе і па сённяшні дзень пад назвай «Наш час»), у Навагрудку — «Звезда», у Лідзе — «Уперад», віцебская «Калгасная трыбуна», скідзельскае «Красное знамя» і іншыя. Як змяніліся танальнасць і змест гэтых газет у час правядзення аперацыі «Баграціён» і пасля вызвалення Беларусі?

А змест перадусім патрыятычна-жыццесцвярджальны, прычым гэта ўжо не пафас гераічнай барацьбы, заклік да стваральнай самаадданай працы, эмацыянальны ўздым блізкай перамогі і спадзяванне на добрую будучыню. Напрыклад, многія выданні напісалі пра мітынг працоўных і партызан Міншчыны: ён адбыўся ў сталіцы ў сярэдзіне ліпеня і сабраў 50 тысяч гараджан і звыш 30 тысяч партызан, якія віншавалі адно аднаго.

## ПАРТЫЗАНСКАЯ ПЕРАКЛІЧКА

«Увосень 1943-га, калі немцы былі выгнаныя з межаў Рэчыцкага раёна, група партызан-аднасяльчан увайшла ў вёску Ямполь. Разам з імі прыйшоў і іх камандзір, старшыня калгаса «Ленінскі шлях» Васіль Васілец, — пісаў летам 1944-га лісток Снядоўскага антыфашысцкага камітэта Беластоцкай вобласці «Бі фашысцкую гадзіну!». — Там, дзе калісьці было квітнеючае сяло, дзе стаялі клуб, кінатэатр, школа, бальніца, сотні дамоў, засталося адно папялішча... Прайшло 8 месяцаў, а не пазнаць сёння вёску Ямполь. Збудавана каля 50 новых хат. Калгасы маюць ферму буйной рагатай жывёлы, авечкагадоўчую і птушкагадоўчую фермы. Завяршаецца будаўніцтва вялікай стайні. Сеў збожжавых калгас правёў за 7 дзён. Учарашнія партызаны ўзначальваюць калгасы і хутка паднімаюць грамадскую гаспадарку. Цяпер у вобласці на кіраўніцкую працу вылучана 285 партызан».

*«Палеская праўда» расказала сваім чытачам пра пінскіх партызан, якія зрабілі значны ўнёсак у вызваленне беларускай зямлі, але самі не дажылі да яго. «Смерцю храбрых загінулі адважныя сыны Радзімы — Ванюша Чуклай, Аляксандр Баруцкі, Мікіта Іванавіч Бандаронец, Іван Жураўлёў і яго сын Сеня Жураўлёў, Лявон Леўчык і многія іншыя... Народ ніколі не забудзе сваіх герояў», — піша выданне, адзначаючы, што ўжо на той час каля 1400 партызан Пінскага злучэння былі ўзнагароджаны і прадстаўлены да ўзнагароды ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза. Аўтар гэтага артыкула, між іншым, не хто іншы, як легендарны партызанскі камандзір, Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр Васіль Корж.*




Газета «За савецкую Радзіму» (Уздзенскі РК КП(б) Б і раённы савет дэпутатаў працоўных) у нумары акурат за 27 ліпеня 1944 года пералічвала страты, нанесеныя сельскай гаспадарцы раёна: 12 вёсак былі цалкам спалены, яшчэ 21 — часткова, 1116 двароў калгаснікаў падпалілі і разрабавалі нямецка-фашысцкія захопнікі. Але рэдакцыя падкрэслівае: час не бедаваць, а адбудоўвацца наноў і ўзнаўляць гаспадарку. «Першапачатковая задача, якая цяпер стаіць перад калгаснікамі і калгасніцамі, перад усёй савецкай грамадскасцю раёна, — у самы кароткі тэрмін аднавіць і ўсімі сродкамі ўмацаваць калгасную гаспадарку, тым самым хутчэй ліквідаваць крывавыя сляды нямецкай акупацыі, — заклікае выданне. — Ужо аднаўлены 51 калгас, дзе на агульных сходах выбраны старшыні і брыгадзіры, праўленні і рэвізійныя камісіі. У Хатлянскім сельсавеце сабраны калгасны інвентар, заканчваецца сенаўборка, ідзе паспяховая падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю».

**...У канцы лета 44-га на першых палосах амаль усіх газет была сельская гаспадарка — рамонт машынна-трактарных станцый, будаўніцтва свірнаў, гумнаў, такоў, стайняў і г. д.**

Таксама ў нумары апублікаваны ліст з дзеючай арміі ад сяржанта Галавенчыка Сямёна Аляксандравіча (жыхара вёскі Пыршава Уздзенскага раёна), які звяртаецца да сваіх уздзенскіх землякоў: «Не сумняваюся, што самаадданай і стаханаўскай працай вы ў хуткім часе залечыце раны, нанесеныя гітлераўскімі ізвергамі нашай роднай гаспадарцы. На працягу трох год я змагаюся на франтах Айчыннай вайны супроць нямецкіх захопнікаў. Са сваімі баявымі сябрамі я біў немцаў на Каўказе, Кубані і ў Крыму. Цяпер мы знішчаем гітлераўцаў у Беларусі. Недалёка той час, калі вораг будзе канчаткова разбіты. Са свайго боку я... не пашкадую жыцця для справы канчатковага разгрому подлай немчуры». І няхай у многіх такіх допісах адчуваецца рука прафесійных публіцыстаў, майстроў прапаганды, але галоўную сваю задачу — падштурхнуць людзей узняцца грамадой, «усім светам», да стваральнай працы — яны паспяхова выконвалі.

## ХЛЕБ І ПАРТЫ

«Рамантуйце і падтрымлівайце ў праездным стане дарогі, чыніце масты, дапамагайце аднаўляць сувязь... Акружайце ўвагай і клопатам воінаў Чырвонай Арміі, арганізуйце клапатлівы догляд за раненымі, — эмацыянальна піша ў ліпені «Новы шлях» Пружанскага райвыканкама. — Паклапаціцеся пра сем'і воінаў Чырвонай Арміі і партызан, а таксама інвалідаў Айчыннай вайны. Таварышы! Уключыцеся ў агульны пад'ём усяго савецкага тылу, які паказвае цуды гераізму на фронце працы. Усё для фронту! Усё для перамогі!»



...У канцы лета 44-га на першых палосах амаль усіх газет была сельская гаспадарка — рамонт машынна-трактарных станцый, будаўніцтва свірнаў, гумнаў, такоў, стайняў і г. д., паспяховае правядзенне жніва, у якім дарослым дапамагалі дзеці і падлеткі, уборка бульбы, выкананне дзяржаўнага плана хлебапаставак, харчовае забеспячэнне Чырвонай Арміі... І ўсё ж не хлебам адзіным жыла краіна — шмат увагі надавалася аднаўленню прамысловых прадпрыемстваў, школ і бальніц, устаноў культуры, бытавому абслугоўванню і іншым важным тэмам мірнага жыцця. Напрыклад, у жніўні 1944-га А. Клімчык расказвае ў лагойскай раёнцы «Новая вёска»: «У будынку, выкарыстоўваемым да новага навучальнага года для Вяпрацкай школы, не было анічога — парт, сталоў, класных дошак. Загадчык школы т. Блешчык знайшла выхад са становішча. Яна склікала сход калгаснікаў, дзеці якіх будуць навучацца ў школе, і звярнулася да іх з просьбай дапамагчы ў рабоце, хто чым можа. За кароткі час калгаснікі адрамантавалі падлогу, зрабілі пабелку сцен, зашклілі вокны. Зроблена 25 парт, 15 сталоў, класныя дошкі, у школу дастаўлена 7 шкафоў». Дробязь? Зусім не, маленькі, аднак яскравы прыклад таго, як вяскоўцам было не ўсё роўна, каб дзеці працягвалі перарваную вайной вучобу.

У Мікашэвічах, піша ў гэтыя ж дні «Палеская праўда», больш за 70 камсамольцаў сабраліся нават не на суботнік — на нядзельнік, каб добраўпарадкаваць чыгуначную станцыю, у Жабчыцкім раёне сабралі звыш 94 тысяч рублёў на пабудову танкавай калоны «Пінскі партызан», а ў Давыд-Гарадоцкім раёне была наладжана наноў праца шавецкай, гарбарнай, швачнай і рыбнай арцеляў, адкрыліся суднаверф і бальніца на 40 ложкаў, 4 фельчарскія пункты, ветлячэбніца, пошта і цырульня, аднаўляліся 4 млыны і мост цераз Гарынь.

**Падаткам абкладаліся нават тыя сем'і, якія выхоўвалі аднаго-дваіх дзяцей, — вось такая прымусова-фінансавая стымуляцыя нараджальнасці...**

*Пра неабходнасць найхутчэйшага вяртання да мірнага жыцця і адбудовы краіны клапаціліся па-рознаму. Цікавыя дакументы знаходзім у адным з ліпеньскіх выпускаў газеты «Па сталінскаму шляху» Лельчыцкага райкама КП(б)Б: указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб падтрымцы цяжарных жанчын, шматдзетных і адзінокіх маці, заснаванні ордэна «Мацярынская слава» і звання «Маці-гераіня», а таксама... «Аб падатку на халасцякоў, адзінокіх і маласямейных грамадзян СССР». Паводле апошняга ўказа падаткам абкладаліся нават тыя сем'і, якія выхоўвалі аднаго-дваіх дзяцей, — вось такая прымусова-фінансавая стымуляцыя нараджальнасці...*

## НА БЕРЛІН!

*«Яшчэ і па цяперашні час нашы войскі і партызаны вылоўліваюць галодных нямецкіх салдат і афіцэраў (і генералаў), якія ў выніку «планамернага адыходу» заблукалі ў беларускіх лясах і балотах, — з'едліва заўважаюць у ліпеньскім выпуску аўтары «Партызанскай праўды» (выданне 6-й брыгады імя Ракасоўскага). — Мы назіралі адступленне «непераможнай» нямецкай арміі... Гарыць зямля пад нагамі ў фашыстаў. Цяпер яны будуць «выроўніваць» і «скарачаць» фронт, верагодна, да Берліна. Ну а далей куды?»*

Сатырычная газета-плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну», якая на гэты час ператварылася ўжо ў часопіс, працягвала выходзіць пад кіраўніцтвам Кандрата Крапівы па май 1945 года — усяго за час Вялікай Айчыннай выйшла 142 нумары. (Насамрэч яна мела шчаслівы лёс і далей: у жніўні 1945-га пачала выдавацца ў Мінску як добра вядомы многім часопіс сатыры і гумару «Вожык».)

«Нашы воіны далі гітлераўцам такія ўрокі геаграфіі, а разам з тым і гісторыі, што ў тупагаловых прытуліўся інтарэс да геаграфіі свету, — кпіць у верасні 1944-га М. Чаўскі. — Бліцкрыгеры паглядаюць ужо на карту Германіі і пачынаюць разумець, што яны ўляцелі ў гісторыю, як мухі ў агонь. Стрэлкі і лініі паварнуліся назад «на фатарлянд» і імкліва ўпіваюцца ў граніцы Германіі. Нямецкім салдатам і афіцэрам... няма часу нават і марыць аб перамозе. Яны заняты вялікім драпам і заклапочаны выратаваннем свайго жыцця».

*Час блізак светлай перамогі,*
*Усе на Захад, як адзін!*
*Для нас няма другой дарогі,*
*Апроч тае, што на Берлін,*

— падсумоўвае ў гэтым жа нумары паэт Анатоль Астрэйка. І, як пакажа зусім хуткі час, «раздавілаўцы» мелі рацыю, стаўшы сведкамі, удзельнікамі і летапісцамі Перамогі...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


КОРОТКИЕ ШУТКИ

„Курортники"

— Почему ваши солдаты имеют такой плохой вид, полковник Драпке?

— Они только что прибыли из советского курорта из Крыма.

— От нашего [illegible] фон Шнапса остались только кожа да кости.

— А от солдат [illegible] и костей не осталось.

Две награды

Ганс: Курт, отчего ты такой мрачный? Ты должен радоваться: ведь тебя наверняка железным крестом наградят.

Курт: Чудак ты, Ганс. Пока я дождусь железного креста, русские наградят меня деревянным.

# ХУТАРАНСКАЯ НАЕЗНІЦА





*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Разумец статных і прыгожых коней Яўгенію навучыў бацька, які ў свой час стаў жыхаром хутара Скрабатуны на Паазер'і і распачаў конегадоўлю. У маладой сям'і Серафімовічаў Яўгенія была першым дзіцем, і забавай для хутарской дзяўчынкі сталі не толькі лялькі, але і жывыя коні. Бацька давяраў дачцэ даглядаць табун, вадзіць буланых на вадапой, чысціць жывёл. Пасля школы Яўгенія паступіла ў Лужаснянскі аграрны каледж па спецыяльнасці ветэрынарыя, пасля працавала ў суседнім сельгаспрадпрыемстве. Цяпер завочна вучыцца ў Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны і марыць адкрыць сваю ветлячэбніцу, а таксама школу верхавой язды, арганізоўваць конныя прагулкі і паходы па азёрах і незвычайным паазерскім ландшафце. Дзяўчына дапамагае бацькам, бо ў сялянска-фермерскай гаспадарцы і аграсядзібе «Конны фальварак» утрымліваецца тры дзясяткі коней пароды беларуская запражная. Некалькі гадоў таму Яўгенія са сваімі малодшымі братамі Віктарам і Міхаілам узвялі летні манеж для заняткаў: трэба вучыць людзей любіць коней.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Глыбоцкі раён.*

*(Больш здымкаў пра тое, як праходзяць заняткі ў манежы на хутары Скрабатуны, глядзіце на сайце zviazda.by.)*



Жэня СЕРАФІМОВІЧ з бацькамі і братамі.



Чулі?

# ДОМІК НА СЕМЯРЫХ

## Сяброўкі купілі ў складчыну дом, каб правесці там бясхмарную старасць

**Кранальная гісторыя адбылася ў кітайскай правінцыі Гуандун, непадалёк ад горада Гуанчжоў. Зусім нядаўна на ўскраіне адной з вёсак з'явіўся цудоўны дом, які адразу ж прыцягнуў увагу мясцовых жыхароў.**

Гэта быў банальны недабуд, які гаспадары кінулі на волю лёсу. З часам яны адважыліся яго прадаць, і пакупніцы знайшліся вельмі хутка. Імі аказаліся сямёра жанчын, якія сябруюць ужо больш за 10 гадоў, з тых часоў як разам працавалі ў адной з рэгіянальных газет. Калі спачатку суседзі здзіўляліся, што змогуць зрабіць маладыя далікатныя жанчыны з гэтым недабудам, то потым пачалі нават зайздросціць. І нездарма!

Сяброўкі яшчэ ў 20-гадовым узросце жартам малявалі карціны бясхмарнай старасці ў сваім уласным доме састарэлых, дзе яны будуць беражліва даглядаць адна адну да апошніх дзён. «Спачатку гэта быў проста жарт, — кажа адна з сяброўак Цзінь Ду Іціаа, — мы марылі, што збяромся разам, калі нам споўніцца 60 гадоў, і будзем жыць разам на пенсіі».



Але калі адна з сяброўак натрапіла на аб'яву аб продажы вялізнага асабняка ў цудоўным маляўнічым месцы, дзе чыстае паветра і крынічная вада, вакол палі і бананавы лес, то яны і хвіліны не сумняваліся. Менавіта ў гэтым ціхім аддаленым ад цывілізацыі месцы жанчыны і вырашылі ўвасобіць свае фантазіі ў жыццё. Вядома ж, будаўнічымі і мантажнымі работамі займаліся прафесіяналы, а вось уладкаваннем яны самі. Паколькі асабняк мае даволі вялікую плошчу (больш за 700 кв. м), то для кожнай з іх знайшлося месца, каб стварыць свае асабістыя апартаменты з непаўторным дызайнам.

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок заключения договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 13.06.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **20.08.2019** в 15ч.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **16.08.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

**ОАО «Гомельоблреклама» (продавец) извещает о проведении** 6 августа 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 50 % в 11.00 в г. Гомеле по ул. Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел.руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-42584, общей площадью 1 616,7 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административный корпус. Составные части и принадлежности: галерея. Забор железобетонный 36,0 м. п. (инв. № 114), вертикальные планировки и благоустройство (инв. № 12), в т. ч.: проезжая часть 632,0 кв. м, борты 42,0 м. п; озеленение 7 деревьев (инв. № 13); распредустройство – 3 шт. (инв. № 32). Информация о земельном участке: кадастровый номер 340100000006004802 площадью 0,1849 га – для эксплуатации и обслуживания административного здания (право аренды). Местонахождение: Гомельская область, г. Гомель, ул. Борисенко, д. 7 | **177 450,00** | **8 872,50** |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблреклама», г. Гомель, ул. Гагарина, 20. П**орядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (0232) 23-23-53 – Ирина Борисовна. Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1) Оплатить задаток на расчетный счет **продавца имущества (ОАО «Гомельоблреклама** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 27 июля 2019 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00 **прием заявлений для участия в аукционе** заканчивается 5 августа 2019 г. в 16.00. **Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения** аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества в** течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договора купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. **В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества.** Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8(029) 126-66-62**

Общее собрание кредиторов ООО «Белинтертранс» по вопросу защиты требований ИООО «АЛИДИ-Вест» состоится 9 августа 2019 года в 17.00 по адресу: Минск, ул. Декабристов, д. 5, пом.1, этаж 2, офис 15. Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями можно по тому же адресу, предварительно согласовав время с управляющим по тел: 8-017-2190670. Также более подробная информация опубликована в объявлении на сайте: http://bankrot.gov.by

УНП 600050171

# МЕТАД ДЖОНСАНА

## Куды павядзе Вялікабрытанію новы прэм'ер?

**Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі традыцыйна ў топе навінных стужак сусветных інфармагенцтваў. Перш за ўсё, дзякуючы абвешчанаму яшчэ ў 2016 годзе выхаду з Еўрасаюза — брэксіту. Днямі ў астраўной дзяржаве адбылася насамрэч гістарычная падзея — змяніўся прэм'ер-міністр. У адстаўку пайшла Тэрэза Мэй, якая займала гэтую ключавую пасаду ў каралеўстве на працягу апошніх трох гадоў. Ёй на змену прыйшоў яркі, неардынарны палітык, новы лідар брытанскай Кансерватыўнай партыі Аляксандр Барыс дэ Пфефель-Джонсан. Ад яго дзеянняў будзе залежаць не толькі ўласна становішча астраўной дзяржавы, але і шмат у чым канфігурацыя сусветнай палітыкі. Куды павядзе Вялікабрытанію новы прэм'ер?**



### ДРЫМОТНЫ АСІЛАК

«Джэрэмі Хант — 46 656 галасоў, Борыс Джонсан — 92 153. З прычыны гэтага я заяўляю, што Борыс Джонсан абраны кіраўніком Кансерватыўнай партыі Вялікабрытаніі», — гэтымі словамі Шэрыл Гілан, выканаўца абавязкаў старшыні Камітэта па арганізацыі выбараў кіраўніцтва торы, пацвердзіла тое, у чым многія не сумняваліся, паведаміў Euronews. Дзякуючы сваім 66,4 працэнта галасоў аднапартыйцаў Джонсан у якасці лідара кансерватараў стаў 77-м прэм'ер-міністрам Злучанага Каралеўства і ў гэтай якасці ў чацвер правёў першае пасяджэнне новага ўрада.

Барысу Джонсану прадказвалі пасаду прэм'ера яшчэ падчас перадвыбарчай гонкі 2016 года. Тады ўнутры Кансерватыўнай партыі пачалася кампанія «Спыні Барыса». Майкл Гоўв быў паплечнікам і правай рукой Джонсана. У дзень, калі Гоўв абвясціў аб сваім удзеле ў барацьбе за пасаду прэм'ера, Борыс Джонсан нечакана для ўсіх зняў сваю кандыдатуру.

Сёлетнія выбары новага прэм'ера не вылучаліся асаблівай інтрыгай. Борыс Джонсан змог заручыцца важкай падтрымкай дэпутатаў-кансерватараў яшчэ ў першым туры перадвыбарнай гонкі. Тады за яго прагаласавалі 114 членаў партыі з 313 (удзельнічалі толькі дэпутаты-торы). Другое месца дасталося Джэрэмі Ханту, ён атрымаў 43 галасы. Такі вялікі адрыў Джонсан захоўваў на трох наступных этапах галасавання, а ў фінале брытанскія букмекеры ацэньвалі імавернасць перамогі Ханта толькі ў адзін працэнт.

Новы лідар торы быў абраны ў выніку галасавання, у якім прыняло ўдзел амаль 140 тысяч членаў партыі. «Ажыццявіць брэксіт, аб'яднаць краіну, перамагчы Джэрэмі Корбіна! (лідара апазіцыйнай лейбарысцкай партыі. — ***Рэд.***) — паабяцаў Джонсан у кароткай прамове, пасля таго як былі абвешчаныя вынікі галасавання. — Мы верым у сябе і ў тое, што нам удасца ўсяго дасягнуць. Нібы дрымотны асілак, мы ўстанем і скінем з сябе кайданы сумневаў і негатыву».

### НАШЧАДАК КАРАЛЯ

Борыс Джонсан атрымаў грунтоўную адукацыю — ён выпускнік Ітана і Оксфарда. Сваю кар'еру пачаў з журналістыкі: пасля звальнення з газеты The Times за выдуманую цытату ён уладкаваўся ў The Daily Telegraph і стаў брусельскім карэспандэнтам выдання. У сваіх рэпартажах Джонсан прадстаўляў кіраўнічы апарат ЕС як бюракратычную машыну, дзе прымаюцца непатрэбныя і дробязныя законы. Еўраскептыцызм дапамог яму заваяваць сімпатыі брытанскіх кансерватараў: у 2001 годзе журналіст стаў членам парламента ад гэтай палітсілы.

У вялікай палітыцы Джонсан тут жа прыцягнуў да сабе ўвагу жартамі і дэманстратыўнай экстравагантнасцю. Публіцы падабалася, што палітык не баіцца памыліцца і здацца смешным; многія ўбачылі ў ім «свайго хлопца», адзначаюць аглядальнікі. Брытанцы ўжо даверылі яму адказныя пасады: у 2008-м жыхары Лондана выбралі Джонсана мэрам і затым перавыбралі на другі тэрмін. Сярод яго дасягненняў на гэтай пасадзе аналітыкі называюць адчувальнае зніжэнне ўзроўню злачыннасці ў горадзе (адразу на 20 працэнтаў) і стварэнне шырокай веласіпеднай інфраструктуры. Важным дасягненнем стала паспяховае правядзенне летняй Алімпіяды 2012 года ў Лондане. Зрэшты, на думку крытыкаў, мэру Джонсану бракавала практычнасці: ён не задаволіў высокі попыт на даступнае жыллё, затое паспеў запусціць канатную дарогу, пабудаваць 180-метровую горку-атракцыён ArcelorMittal Orbit.

Палітык не раз дазваляў сабе рэзкія выказванні расісцкага і сексісцкага характараў. Адной з сваёй калонцы для The Telegraph ён назваў афрыканцаў «негрыцятамі», а пазней параўнаў мусульманскіх жанчын у бурках з рабаўнікамі банкаў і паштовымі скрынямі. Нягледзячы на такую недыпламатычнасць, у ліпені 2016-га Джонсан атрымаў пасаду міністра замежных спраў у кабінеце Мэй і падаў у адстаўку толькі праз два гады — з-за нязгоды з мяккай стратэгіяй у перамовах з ЕС.

Бі-бі-сі высветліла, што Джонсан — нашчадак караля Вялікабрытаніі Георга II, які кіраваў у XVIII стагоддзі і быў другім манархам у дынастыі, якая працягваецца дагэтуль. Увогуле брытанскі прэм'ер — сваяк адразу некалькіх манаршых дынастый Еўропы, у тым ліку Рамавых. Джонсан быў двойчы жанаты. З першай жонкай — прызнанай прыгажуняй Оксфарда — ён абмяняўся пярсцёнкамі ў студэнцкія гады, а ў 1992 годзе пара развялася. Праз два тыдні ён зноў быў жанаты — з сяброўкай дзяцінства Марынай Уілерам, юрысткай і праваабаронцай, якая пасля нарадзіла яму чацвярых дзяцей. Яшчэ адно дзіця з'явілася ў палітыка ў выніку пазашлюбнай сувязі. Цяперашняя спадарожніца Джонсана — Кэры Сімандс, і яна добра вядомая работнікам медыя Вялікабрытаніі з цэлага шэрагу прычын. Перш за ўсё, яна дачка сузаснавальніка газеты The Independent. Цяпер Кэры Сімандс лічаць адной з самых уплывовых постацяў у сферы брытанскага палітычнага піяру.

### БЕЗ РУЛЯ І ВЯТРЫЛ

Борыс Джонсан абяцае рашуча вывесці краіну з Еўрасаюза ў прызначаны тэрмін — 31 кастрычніка. Але на гэтым шляху яго чакае амаль немінучы правал, адзначае «Бі-бі-сі». Ён абяцае зрабіць гэта, нават калі не ўдасца дамовіцца з Бруселем аб новых умовах выхаду, якія задаволілі б урад і парламент. Джонсан дэманструе гатоўнасць да «жорсткага брэксіту» — выхаду з ЕС без пагаднення.

Але новага прэм'ера ў гэтым выпадку, прадказвае большасць брытанскіх палітычных каментатараў, чакаюць жорсткі і хуткі палітычны разгром і прыкладна такое ж прыніжэнне, якое перажыла Тэрэза Мэй. Само з'яўленне Борыса Джонсана на пасадзе прэм'ера і яго цвёрдая пазіцыя ў дачыненні да ЕС паўлічаць і кансалідуюць нефармальную групу яго праціўнікаў у фракцыі кансерватараў у Палаце абшчын. І гэтая група, якая выступае супраць «жорсткага брэксіту», у супрацоўніцтве з апазіцыяй зможа тарпедаваць любыя пачынанні новага кіраўніка ўрада.

Падаў у адстаўку крытык новага прэм'ера, адзін з самых аўтарытэтных палітыкаў у партыі, намеснік міністра замежных спраў сэр Алан Данкан. «Мяне вельмі турбуе, што яго нясе без руля і вятрыл, усё ў яго без плана, па натхненні, на жывую нітку, — сказаў «Бі-бі-сі» Алан Данкан, які да лета мінулага года быў намеснікам Джонсана — міністра замежных спраў. — Я не маю да яго ніякай асабістай варожасці. Я проста думаю, што ён уляпаецца ва ўрадавы крызіс». У аўторак у адстаўку падала міністр адукацыі Эн Мілтан.

Паводле ацэнак аналітыкаў, да тых, хто ўжо заявіў пра сыход, амаль напэўна далучацца кіраўнік апарату Мэй у рангу міністра Дэвід Лідынгтан і іншыя члены ўрада рознага ўзроўню.

### ПА РУКАХ І НАГАХ

На мінулым тыдні Палата абшчын ужо распачала адзін заканадаўчы манеўр, мэта якога — пазбавіць прэм'ер-міністра магчымасці прыпыніць работу парламента ў прамежку паміж 9 кастрычніка і 18 снежня, каб ён не перашкодзіў жорсткаму выхаду краіны з ЕС. Пры гэтым 36 торы праігнаравалі нормы партыйнай дысцыпліны: 17 з іх галасавалі за гэтую папраўку, 19 устрымаліся.

У апазіцыі, у фракцыі лейбарыстаў, ёсць прыхільнікі брэксіту любым коштам, гатовыя падтрымаць Джонсана, але іх менш за дзясятак, і гэтая «гірка» занадта малая, каб ураўнаважыць мяцежнікаў-торы. Усе астатнія лейбарысты, як і дэпутаты ад чатырох малых апазіцыйных партый, як мінімум супраць выхаду з ЕС без пагаднення, а як максімум — за яго адмену з дапамогай другога рэферэндуму.

Разам з апазіцыяй гэтыя дэпутаты-кансерватары могуць не толькі скаваць Джонсана па руках і нагах, але і — у крайнім выпадку — адправіць яго ў адстаўку. Лейбарысты не выключаюць, што ўнясуць прапанову аб вотуме недаверу прэм'еру, прычым, магчыма, у самы бліжэйшы час. «У яго, магчыма, не застанецца іншага выйсця, акрамя як аб'явіць датэрміновыя выбары, хоць ён і казаў, што не будзе звяртацца да краіны, пакуль не ажыццявіць брэксіт», — разважае рупар кансерватараў-еўраскептыкаў газета Daily Telegraph.

Між тым перамога на пазачарговых выбарах кансерватарам ні на чале з Джонсанам, ні без яго зусім не гарантаваная. Па звестках апытанняў, якія ў ліпені праводзілі вядучыя сацыялагічныя кампаніі YouGov, Comres і Opinium, Кансерватыўная партыя цяпер сабрала б 23-25 працэнтаў, і па некаторых з гэтых апытанняў саступае лейбарыстам, а ў патыліцу ім дыхае новая Партыя брэксіту. Зрэшты, у брытанскай сістэме выбараў рэйтынгі не транслююцца наўпрост у долю месцаў у Палаце абшчын. Калі праціўнікі Джонсана ў парламенце не атакуюць яго неадкладна пасля прызначэння, то барацьба разгорнецца на поўную сілу ў пачатку восені. 25 ліпеня Палата абшчын сышла на вакацыі, якія працягнуцца да 3 верасня.

### ЯК ВЫЙСЦІ З ТУПІКА?

Свае віншаванні Барысу Джонсану ўжо перадалі Еўракамісія, якая выказала надзею, што супрацоўніцтва з новым кіраўніком брытанскага ўрада будзе «аптымальным», прэзідэнт ЗША, які заявіў, што Джонсан стане «выдатным» прэм'ерам, і прэзідэнт Францыі, які паведаміў, што «гарыць жаданнем» працаваць з ім. «Кампанія скончана, цяпер — за справу», — заявіў новы брытанскі прэм'ер Борыс Джонсан, паабяцаўшы надаць эканоміцы краіны новы імпульс. Пытанне толькі ў тым, як менавіта ён збіраецца дасягнуць такога выніку, бо пасля правядзення рэферэндуму па брэксіце Вялікабрытанія апусцілася на апошняе месца ў спісе вядучых эканомік «вялікай сямёркі».




У брытанскім упраўленні па бюджэтнай адказнасці адзначаюць, што ў выпадку выхаду з ЕС без здзелкі ўзровень беспрацоўя перавысіць пяць працэнтаў, цэны на нерухомасць зваляцца на 10, а ВУП зменшыцца на два працэнты. У Нацыянальным інстытуце эканамічных і сацыяльных даследаванняў лічаць, што ў эканоміцы ўжо пачалася рэцэсія. У дзелавых колах заклікаюць новага прэм'ер-міністра ўнесці пэўнасць, а ў ідэале — правесці спарадкаваны брэксіт.

Брытанскі журналіст Джэймс Батлер на старонках The New York Times назваў абранне Джонсана пачаткам канца Вялікабрытаніі, а яго самога — прэм'ерам, які прывядзе краіну да развалу. Каб развеяць усе асцярогі і ўвайсці ў гісторыю краіны як герой, а не як няўдалы прэм'ер, у Джонсана застаецца зусім мала часу. Верасень-кастрычнік абяцаюць быць гарачымі палітычнымі месяцамі ў Вялікабрытаніі. І галоўным іх героем (або антыгероем) стане Борыс Джонсан.



**Захар БУРАК.**

Жыццялюбы

# ФІЛАСОФІЯ ПРЫГАЖОСЦІ

## Больш за 50 гадоў сталічны клуб самадзейных мастакоў злучае прыроду і фантазію

**МІНЧАНІН Аляксандр ЛЕЙКО шмат гадоў кіруе клубам мастакоў-аматараў «Прырода і фантазія» — гэтаму творчаму аб'яднанню, дарэчы, летась споўнілася ажно 50 гадоў. А яшчэ ён ладзіць выстаўкі майстроў у дзясятках беларускіх гарадоў, вядзе фоталетапіс клуба, збірае і беражліва захоўвае прыродную скульптуру і біжутэрыю, вырабленую адной з былых удзельніц творчай суполкі, знакамітай актрысай Стэфаніяй Станютай.**

— Мы пазнаёміліся са Стэфаніяй Міхайлаўнай у 1984 годзе на адной з выставак цалкам выпадкова, — згадвае Аляксандр Аляксандравіч. — Убачыўшы мае работы, зробленыя з каранёў, якія я знайшоў у тарфяніку, яна сказала: «Гэты чалавек павінен быць у нас у клубе». А на той час лясной скульптурай яшчэ ніхто ў клубе не займаўся, толькі разьбярствам, і мае творы, пакрытыя масцікай, усім спадабаліся, бо яны захоўваюць жывую структуру дрэва.

### Паміж рамеснікамі і элітай

*Секцыя «Прырода і творчасць» стала дзейнічаць пры сталічным Доме прыроды яшчэ ў 1968 годзе. А вось выстаўкі сваіх работ мастакі-аматары ладзілі не толькі ў Мінску і іншых беларускіх гарадах, але і на ВДНГ у Маскве, і ў галерэі Патсдама. З 1970 года адной з пастаянных удзельніц мастацкай суполкі, якая ў 1980-х ператварылася ў клуб, была і народная артыстка СССР і БССР Стэфанія Станюта, якая захаплялася вырабам біжутэрыі з прыродных матэрыялаў.*

У 1990 годзе клуб ледзьве не спыніў існаванне — са 150 удзельнікаў у ім засталося ўсяго сем. «Тады Стэфанія Міхайлаўна сказала мне: «Шаноўны Алесь, бяры справу ў свае рукі і кіруй». — «Кім?» — пытаюся. — Людзей амаль не засталося». — «Я восьмая, ты дзявяты, збяром пакрысе іншых. Трэба ісці да людзей і несці ім творчасць, тады майстры падцягнуцца». І сапраўды, падцягнуліся: сярод цяперашніх удзельнікаў клуба — звыш 50 майстроў ва ўзросце ад 17 да 85 гадоў, якія займаюцца рознымі відамі вышыўкі, вязаннем, стужкавым дэкорам, бацікам, выпальваннем па дрэве і тканіне, разьбярствам, керамікай, фларыстыкай, прыроднай скульптурай, жывапісам... Практычна ўсіх кіраўнік ведае па імені і прасоўвае іхнія творы ў мастацкія экспазіцыі, што выстаўляюцца, напрыклад, у сталічных і раённых бібліятэках, дамах культуры, цэнтрах народнай творчасці, у школах і гімназіях. Мінск, Полацк, Івянец, Мар'іна Горка, Навагрудак, Мядзел, Лагойск, Бабруйск, Іўе... Толькі за апошнія дзесяць гадоў выстаўкі клуба «Прырода і фантазія» прайшлі ў 60 беларускіх гарадах і мястэчках.



«Паглядзіце, такую форму назнарок не прыдумаеш!» — паказвае Аляксандр Аляксандравіч творы прыроднай пластыкі.

### Каралі з маісу і вікі

— Стэфанія Міхайлаўна пайшла з жыцця ў лістападзе 2000 года, але нават пасмяротна засталася ганаровым членам нашага клуба: на дзень яе нараджэння, 13 мая, штогод мы збіраемся і едзем на магілкі — прыносім кветкі, дзелімся ўспамінамі. І аднойчы зразумеў для сябе, што нельга, каб яе работы згубіліся (яна сама з задавальненнем насіла ўласнаручна зробленыя ўпрыгожанні, але шмат якія і дарыла). І я пачаў гэтыя рэчы збіраць. Хтосьці прыносіў проста так, адна жанчына, помню, папрасіла хоць шакаладку ўзамен. Цалкам бескарысліва перадала многія работы і напісала дароўную на іх нявестка Стэфаніі Станюты, Ірына Аляксееўна Міхайлава-Станюта. Больш за ўсё ў маёй калекцыі — біжутэрыі, зробленай з прыродных матэрыялаў, — 60 адзінак. Некаторыя з тых работ ужо рассыпаліся, бо ім больш чым 40 гадоў, а ўмоў для рэстаўравання і захоўвання асабліва ніякіх, так і ляжаць у адзіным куфры. Таксама ёсць сем лясных скульптур і 18 пластык прыродных формаў Стэфаніі Міхайлаўны. Не падумайце, што я збіраю гэтыя творы проста дзеля збірання і валодання, — калекцыя час ад часу выстаўляецца разам з рэдкімі фотаздымкамі і рэчамі, што належалі Стэфаніі Станюце. Амаль да канца гэтага года такая выстаўка, напрыклад, будзе праходзіць у Мар'інай Горцы.

З усіх паездак, гастроляў і водпускаў, згадвае Аляксандр Лейко, вялікая актрыса прывозіла не якія-небудзь дэфіцытныя тавары або ласункі, а матэрыялы для работы: карэньчыкі, карчакі, насенне экзатычных раслін, з якіх нараджаліся бранзалеты, каралі, завушніцы... Некаторыя работы даюць больш уяўлення аб прыродзе, чым урокі біялогіі: хто з нас без падказкі помніць, як выглядаюць карабачкі і насенне брызгліны альбо, скажам, зярняткі вікі? «Да ўсяго, што яна рабіла, падыходзіла з мяккім гумарам і цеплынёй і, магчыма, таму, што вырасла ў сям'і вядомага мастака, умела бачыць прыгажосць там, дзе многія іншыя прайшлі б і не заўважылі, — перабірае экспанаты калекцыі Аляксандр Лейко. — Яна любіла дарыць свае творы, каб тыя прыносілі радасць іншым. А на сходы нашага клуба, зноў жа дзеля радасці і кампаніі, часта прыносіла «Ленінградскія» тарты, каб жыццё было смачнейшае. Паэтычная натура Стэфаніі Станюты праяўлялася і ў арыгінальных назвах, якія яна давала сваім творам. Вось паглядзіце: тут у нас «Лежабока», «Сівы лунь», «Грацыя»... Кожны бачыць у іх нешта блізкае для сябе».



Стэфанія Станюта і яе «журавок», знойдзены на марскім беразе. Вялікая актрыса часта ўдзельнічала ў выстаўках секцыі «Прырода і фантазія» і з задавальненнем дарыла свае работы тым, каму яны падабаліся.

### Не пра грошы, а пра душу

Адзінае, аб чым сумуе кіраўнік клуба — у «Прыроды і фантазіі» ёсць больш за 1,5 тысячы разнастайных твораў, ёсць мастацкі вопыт і жаданне перадаць яго іншым энтузіястам, але няма рэгістрацыі і пастаяннай «прапіскі». Абяцалі знайсці куток у сядзібе Лошыцкага парку, але пасля рамонту прапанавалі толькі ўзяць пакойчык у арэнду. Зразумела, што рыначны падыход, стасункі з гледачамі на ўмовах арэнды памяшканняў і выставачных залаў мастакі-аматары не пацягнуць. Вось і грукае Аляксандр Лейко ў дзверы розных інстанцый, спрабуючы знайсці прытулак для клуба. А ён тым часам працягвае існаванне і быццам па ланцужку перадае ўсё новым людзям натхненне і ўменне бачыць прыгажосць навокал. «Можа, у гэтым стагоддзі справа з месца і не зрушыцца — але раптам, калі я ўжо сыду на пакой, знойдзецца чалавек або арганізацыя, якія змогуць узяць наш клуб пад крыло? — дзеліцца марай кіраўнік клуба. — Калі хтосьці пажадае да нас прымкнуць, то мы заўжды гатовыя паказаць і навучыць, што такое піраграфія, прыродная скульптура альбо стужкавы дызайн. Галоўнае, я так лічу, трэба несці людзям прыгажосць, пакуль ты здольны гэта рабіць, пакуль не выпрацаваў свой рэсурс».



У сваіх каралях, завушніцах, брошках Стэфанія Міхайлаўна магла скарыстаць самы розны матэрыял: зярняткі брызгліны, кавы, маіс, сплюснутую шышку, мускатны ці грэцкі арэх і нават... смажаныя да рознай ступені макаронныя зорачкі!

Ці мастацтва гэта? Безумоўна. Няхай наіўнае, але заўжды запатрабаванае, якое і мае не проста права на існаванне, а кола сваіх прыхільнікаў. А яшчэ, на маю думку, клуб «Прырода і фантазія» — з'ява сацыяльна-культурная, гэта не толькі адкрыццё новых мастацкіх самародкаў, але таксама своеасаблівая арт-тэрапія і прафілактыка адзіноты сучаснага чалавека, не важна, у малым ці вялікім горадзе. І вельмі хацелася б, каб на 50 гадах існавання гісторыя клуба не скончылася, а працягнулася з новай старонкі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК, фота аўтара.**

---

Дні культуры Узбекістана ў Беларусі

**Сіражыддзін Саід:**

# «Беларусь нас прыцягвае і ўзвышае...»

**Днямі ў Мінску пройдуць Дні культуры Узбекістана. Сярод гасцей з Ташкента — і старшыня Саюза пісьменнікаў Узбекістана Сіражыддзін Саід. Мы набралі напярэдадні падзеі ташкенцкі нумар спадара Сіражыддзіна і пацікавіліся складам дэлегацыі, намерамі ўзбекскіх сяброў у сувязі з візітам у Беларусь. І вось што пачулі ў адказ:**

— Па-першае, хачу пазнаёміць вас, чытачоў урадавай газеты «Звязда», з удзельнікамі той групы нашай дэлегацыі, якая, пэўна, лепей за астатніх ведае Беларусь. Гэта — і старшыня Камітэта па міжнацыянальных адносінах і сяброўскіх сувязях з замежнымі краінамі пры Кабінеце міністраў Рэспублікі Узбекістан Рустамбек Курбанаў, і старшыня Акадэміі мастацтваў Узбекістана Акмал Нурыддзінаў, і рэктар Ташкенцкага дзяржаўнага ўніверсітэта ўзбекскай мовы і літаратуры Шухрат Сіражыддзінаў, і старшыня Ташкенцкага гарадскога беларускага нацыянальнага цэнтра «Світанак» Святлана Дудзюк, і прафесар кафедры рускай мовы і літаратуры Узбекскага дзяржаўнага ўніверсітэта сусветных моў Анатоль Ліхадзіеўскі. Мы прымем удзел у Форуме рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Узбекістан ад імя ўсёй творчай і навуковай інтэлігенцыі нашай краіны.

Па-другое, мы едзем да сяброў. Мы ўжо навялі пэўныя масты, якія ўсё болей збліжаюць нашы краіны, нашы народы і нашы культуры. Летась я браў удзел у Дні беларускага пісьменства ў Іванаве на Берасцейшчыне. Вельмі ўражаны гэтым святам. Яму папярэднічаў і міжнародны круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго», які праходзіў ва ўзноўленай сядзібе геніяльнага творцы Напалеона Орды. З таго часу мы пачалі выбудоўваць стасункі з пісьменнікамі Беларусі. У Ташкенце выйшаў беларускі выпуск часопіса «Сусветная літаратура».

Узбекская дэлегацыя прыняла ўдзел у лютаўскай Мінскай кніжнай выстаўцы-кірмашы і міжнародным сімпозіуме літаратараў «Пісьменнік і час». Беларусь нас прыцягвае і ўзвышае... Гасцявала ў Мінску і пісьменніца Рысалат Хайдарава. Цяпер яна працуе над перакладам анталогіі сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры на ўзбекскую мову. Нядаўна пабываў у Мінску, наведаў іншыя куточкі вашай краіны пісьменнік і публіцыст Кучкор Наркабіл. Ён працуе над кнігай пра Беларусь 1941 года.

*— Сапраўды, тэма Вялікай Айчыннай вайны ці не самая важкая ў збліжэнні нашых народаў, ва ўзнаўленні гістарычнай памяці, аднолькава важная і для ўзбекаў, і для беларусаў...*

— Так, ведаю, што ў вашым выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» рыхтуецца да выдання кніга пра ўзбекаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную на тэрыторыі Беларусі... Мы ўдзячны вам за такі клопат, за праяву такой увагі да агульнай праблематыкі. Летась, дарэчы, выйшаў узбекскі выпуск часопіса «Беларусь». І сёлета гэтае выданне таксама толькі што прысвяціла Узбекістану спецыяльны нумар. У часопісе «Беларусь», безумоўна, ёсць старонкі пра літаратуру, пра пісьменнікаў Узбекістана і Беларусі.

А ў нядаўнім гадавіку беларускага альманаха «Даляглядыі» пабачыла свет падборка паэзіі розных мастакоў слова з Узбекістана ў перакладзе на беларускую мову. Сярод іншых вылучаецца паэзія народнага паэта Узбекістана, героя Узбекістана Эркіна Вахідава. Цяпер, дарэчы, вядомы беларускі паэт Навум Гальпяровіч працуе над перакладам паэмы Эркіна Вахідава «Паўстанне бессмяротных», прысвечанай бенгальскаму паэту-пакутніку Казі Назруло Ісламу.

У час Дзён культуры Узбекістана ў Беларусі ў Літаратурным музеі Янкі Купалы пройдзе круглы стол, прысвечаны беларуска-ўзбекскім літаратурным сувязям. Мяркую, што нам будзе пра што пагаварыць з беларускімі калегамі.

*— У складзе вашай дэлегацыі ёсць і беларусы...*

— Так, тыя беларусы, хто прадстаўляе яшчэ і грамадскую супольнасць вашых землякоў у Ташкенце. Святлана Дудзюк узначальвае беларускую грамаду ва Узбекістане. А доктар філалагічных навук Анатоль Сцяпанавіч Ліхадзіеўскі — сын славутага беларускага і ўзбекскага вучонага Сцяпана Ліхадзіеўскага, які доўгія гады таксама жыў у Ташкенце. Менавіта ён пераклаў творы многіх узбекскіх паэтаў на рускую і беларускую мову. А ўзбекістанцаў пазнаёміў з Анатолем Франсам, вывучэнню жыцця і творчасці якога аддаў шмат сіл і часу. Уражанне такое, што мы вельмі блізкія адны да адных — узбекі і беларусы. І таму, як на маю думку, наша гуманітарная дзейнасць шмат у чым павінна быць супольнай.

*— Дзякуй, спадар Сіражыддзін, за добрыя словы. Добрага чарговага знаёмства з Мінскам і з Беларуссю ўвогуле!*

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9 |
| **Вид аукциона** | Аукцион по комбинированной схеме (сначала на понижение, затем на повышение цены недвижимого имущества). |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование, площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| 1 | Гараж на 4 автомашины, 89,3 кв. м | 102/С-9461 | Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 0,0245 га, предоставлен Продавцу на праве аренды до 31.12.2114 для обслуживания здания гаража на 4 автомашины |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 8 875,06 бел.руб.** | **Шаг понижения цены: 443,75 бел. руб.** |
| **Минимальная цена – 8 431,31 бел. руб.** | **Шаг повышения цены: 443,75 бел. руб.** |

**Срок подписания договора купли-продажи: 30** рабочих дней после проведения Продавцом корпоративных процедур по согласованию заключения сделки (в случае заключения договора купли-продажи с единственным участником аукциона, выразившим согласие на приобретение Лота по начальной цене, увеличенной на 5 %). В ином случае (2 и более участников торгов) – 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Информация по внесению задатка**

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Оплата государственной пошлины за государственную регистрацию договора купли-продажи производится Покупателем. Расходы по государственной регистрации перехода прав на объект недвижимости возлагаются на Покупателя. До внесения задатка участники аукциона в обязательном порядке знакомятся с проектом договора купли-продажи

Предмет аукциона может быть снят с аукциона организатором в любое время до объявления его проданным

Предыдущее извещение о проведении торгов было опубликовано в газете «Звязда» 21.06.2019

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | 29.08.2019 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» |
| **Дата и время окончания приема документов** | 27.08.2019 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» |
| **Контактные телефоны** | **+37517-280-36-37; +375 29-317-95-42. auction@cpo.by; www.cpo.by** |

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гродненская обувная фабрика «Неман» (г. Гродно, ул. Советских Пограничников, д. 95) 20 августа 2019 года

| Вид аукциона открытый | Лот № 1 |
|---|---|
| Предмет аукциона | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-32552 (склад материалов с гаражом), общей площадью 2983,0 кв. м с составными частями: сооружение с инвентарным номером 400/С-133598 (тепловая сеть), сооружение с инвентарным номером 400/С-133599 (благоустройство территории), сооружение с инвентарным номером 400/С-133600 (водопроводная сеть), сооружение с инвентарным номером 400/С-133601 (канализационная сеть) |
| Начальная цена продажи | **1 236 924,00 руб. (в т. ч. НДС 20 %)** |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 440100000001010781<br>0,3086 га |
| Месторасположение земельных участков | **г. Гродно, ул. Советских Пограничников, д. 95** |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования |
| Продавец | **Открытое акционерное общество «Гродненская обувная фабрика «Неман», г. Гродно, ул. Советских Пограничников, д. 95, тел.: 8 (0152) 520400, 527200** |
| Сумма задатка | **123 692,40 руб.** |
| Организатор аукциона | Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720010 |
| Дата проведения аукциона | **20 августа 2019 года** |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 |
| Дата и время начала приема документов | 25 июля 2019 года, 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 14 августа 2019 года, 17.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»; **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 30 дней с момента заключения договора купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Адрес сайта: www.grodno.gov.by**

## Управляющий ООО «Чемпион комфорта» ООО «Зовель» – организатор торгов извещает о проведении 28 августа 2019 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, каб. 310 первых торгов в форме аукциона по продаже имущества, бывшего в употреблении, шаг торгов – 5 % от первонач. цены, задаток – 10 % от первонач. цены:

1. Конвейерная печь Middlebe Marshail – 8 300,00 руб. (задаток 830,00);
2. Печь пароконвекционная SCC61 пром. – 5 868,00 руб. (задаток 586,80);
3. Фритюрный аппарат открытого типа OEA-321 – 3 624,96 руб.(задаток 362,49).

Ознакомление с формой заявления на участие в торгах, с формой заявки, договором и др. документами по тел. 8029 1790240. Место нахождения имущества – г. Минск, ул. Дзержинского, 104. Прием заявлений на участие в торгах: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, каб. 310 до 17.00 26.08.2019 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 26.08.2019 г. на р/с ООО «Чемпион комфорта» в BY79PJCB30120194021000000933 ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 191097269. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения имущества по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора – в теч. 3 раб. дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в теч. 30 календ. дней со дня заключения договора оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в течение 5 банк. дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Возмещение затрат осуществляется участником, выигравшим торги. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до их проведения.

УНП 191097269

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 10.09.19 повторного открытого аукциона (первоначальная стоимость снижена)

Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 710/С-59153 – **административное здание, площадь – 968,2 кв. м. Капитальное строение с инв. № 710/С-59154 – гараж на 3 автомашины,** площадь – 71,9 кв. м, Капитальное строение с инв. № 710/С-77019 – забор. Объекты, входящие в состав Лота № 1, расположены по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Советская, д. 74, на земельном участке с кадастровым номером 741000000006001548, площадью – 0,1379 га

***Начальная цена продажи: 310 000,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Размер задатка: 31 000,00 бел. руб.***

**Дата, время и место проведения аукциона: аукцион состоится 10 сентября 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 09.09.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Спецмонтажстрой-179 г. Могилев», УНП 700012410, г. Могилев, Славгородское шоссе, 171, 47-60-02

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. +375 222 72-41-14

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 01.11.18, 26.12.19, 16.02.2019, 10.04.19 и 30.05.19 г.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +37529-624-26-25; +37529 550-09-56**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Торгмаш»

**Предмет торгов – Лот:**

1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-4881, площадью 1153,1 кв. м (наименование: здание котельной; назначение: здание специализированное энергетики), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 141000000001002734, площадью 0,5501 га, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Чернышевского, 65Б. Составные части и принадлежности: одна кирпичная, одна панельная пристройки, кирпичная насосная, бетонное крыльцо;

2) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-99163, площадью 56,9 кв. м (наименование: трансформаторная подстанция; назначение: здание специализированное энергетики), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 141000000001002734, площадью 0,5501 га, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Чернышевского, 65А.

3) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-98927, площадью 3000,0 кв. м (наименование: автомобильная стоянка; назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 141000000005001000, площадью 0,3000 га, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Чернышевского, 96. Составные части и принадлежности: ограждение, ворота, ворота, калитка, площадка, площадка, нежилое здание;

4) Панель ЩО-70, инвентарный номер 3397;
5) Панель ЩО-70, инвентарный номер 3401;
6) Панель ЩО-70, инвентарный номер 3402;
7) Панель ЩО-70-3-20, инвентарный номер 3494;
8) Панель ЩО-70-3-37, инвентарный номер 3495;
9) Панель ЩО-70-3-20, инвентарный номер 3496;
10) Камера КСО-366-44, инвентарный номер 3365;
11) Камера КСО-366-44, инвентарный номер 3366;
12) Камера КСО-366-14, инвентарный номер 3367;
13) Камера КСО-366-15, инвентарный номер 3368;
14) Камера КСО-366 с сек. раз, инвентарный номер 3369;
15) Камера КВ-1310-12,5-630 ввод, инвентарный номер 3370;
16) Камера КВ-1310-12,5-630 ввод, инвентарный номер 3371;
17) Камера КВ-1310-12,5-630 секц., инвентарный номер 3372;
18) Блок панелей ЩО-70, инвентарные номера 3373, 3374, 3375, 3376, 3377, 3378, 3379;
19) Трансформатор ТМГ-1000/10/0,4 ДУН-11Y1, инвентарный номер 3363;
